# Слова

Час – самы каштоўны рэсурс у нашым жыцці. Так шмат хто лічыць. Але ў гэтым заключана толькі доля праўды. Хіба ёсць у ім сэнс, калі больш не засталося таго, на што яго захочацца выдаткаваць.

Аднак не кожны прызнае каштоўнасць і важнасць слова. Прынамсі, да пэўнага моманту. Словы ў нашым жыцці адыгрываюць ключавую ролю, калі не сказаць больш. Кажуць, пачынаеш усведамляць каштоўнасць нейкіх рэчаў толькі пасля таго, як губляеш. На жаль, гэта і мой выпадак таксама. Напэўна, не мець чагосьці часам лягчэй, чым, спазнаўшы, пазбавіцца.

Дарагі дзённік, гэта мой першы і ці не апошні запіс тут і мой першы дзённік у жыцці. Раней у мяне ніколі не было неабходнасці ў выражэнні сваіх думак на паперы. Аднак добрыя абставіны маюць адну жудасную ўласцівасць – мяняцца ў горшы бок. Як шкада, што на лісціку немагчыма перадаць усіх эмоцый, якія я зараз перажываю. І ўсё ж я спадзяюся, што гэта неяк дапаможа перажыць мне ўвесь гэты боль. Мой псіхолаг параіў рабіць такую практыку – запісваць усе свае думкі і перажыванні, выказваць эмоцыі, пачуцці. Магчыма, праз некалькі гадоў я буду перачытваць гэта і разумець, што гэты перыяд майго існавання ўжо завершаны, што я змагла гэта перажыць. А калі змагла перажыць гэта, тады няма нічога немагчымага ў гэтым жыцці.

З самага нараджэння кожны месяц у мяне была зайздросная колькасць слоў, якія я магла выдаткаваць куды хацела. Гэта перадалося мне ў спадчыну. Мае бацькі абодва былі з паспяховых сем'яў і самі дасягнулі нямалых вышынь. Але, на жаль для многіх, у нашым свеце ўсё зроблена так, што багатымі нараджаюцца, а не становяцца. І багатых, як можна зразумець, у нас значна менш, чым бедных. Адзіны спосаб дамагчыся вышынь чалавеку з падобнай сям'і – гэта паспяхова выйсці замуж ці ажаніцца. Але звычайна такое не вітаецца сем'ямі багатых. Таму, як правіла, багатыя жэняцца з багатымі, а бедныя – ужо як атрымаецца.

Чаму ж багацце залежыць ад слоў? – можаце пацікавіцца вы. А ўсё вельмі проста: тыя, у каго слоў занадта шмат і няма куды іх патраціць, могуць захоўваць іх на будучыню, гэта значыць, адкладаць. За словы можна купіць многае: машыну, дом, нават прадпрыемства. Лёгка здагадацца, што гэта існая раскоша. І можна літаральна па пальцах палічыць такіх шчасліўчыкаў. Іх усе ведаюць у твар – гэтых лепшых людзей. Лепшых, таму што багатых. Лепшых, таму што паспяховых.

Ніколі не лічыла гэта справядлівай прыладай нашага свету, хоць і сама да гэтай «эліты» належу. Мне не зразумела, чаму словы даюцца не паводле заслуг, а проста так. Гэта справа поспеху, так, але ж для кагосьці гэта проста пытанне жыцця і смерці, прычым у прамым сэнсе гэтага слова, на жаль. Патрэбна аперацыя – без праблем, заплаці пару мільёнаў слоў – і ты здаровы. Ды як жа тут мільён назбіраеш, калі бедным даецца менш за тысячу ў месяц. Ну а калі такому чалавеку пашанцавала – і ў адзін з месяцаў выпаў мільён ці нават больш, ён наўрад ці захоча раўнамерна яго размеркаваць. Ён патраціць іх адразу ж. Гэта як жыць пад вадой, увесь час затрымліваючы дыханне, а потым,

пры найменшай магчымасці вынырнуць, хоць на секундачку, жаласна хапаць паветра, спрабуючы запоўніць ім усе лёгкія. Балазе, мяне бацькі навучылі шанаваць тое, што я атрымліваю. Я не самы гаманкі чалавек, але часам пагаварыць, вядома, хочацца.

Кожны месяц мне даецца каля 50 мільёнаў, з якіх я і паловы магу не выдаткаваць. За вылікам курсаў прамоўніцкага і акцёрскага майстэрства, вакалу, кніжнага клуба, разнастайных выступленняў і канферэнцый, у якіх я ўдзельнічаю, я б выдаткоўвала не больш за 10 мільёнаў штомесяц. А ў кагосьці іх усяго тысяча...

Вы можаце пацікавіцца, куды я марную ўсе астатнія 40 мільёнаў. Па-першае, імкнуся дапамагаць людзям, якія жывуць у нястачы. Наша сям'я арганізавала першы ў краіне афіцыйны дабрачынны фонд, які дапамагае людзям, што жывуць у нястачы, забяспечваючы іх па магчымасці. У асноўным гэта цяжка хворыя людзі. Я штомесяц пасылаю 20 мільёнаў слоў у гэты фонд і гэтым самым таксама ўношу свой уклад у сямейныя справы. Вы можаце падумаць, што такім чынам можна пакрыць праблемы вельмі многіх людзей... Так... Аднак не ўсё так проста. Ахвяруе вельмі малая колькасць людзей. Яны лепш назапасяць сабе на трэці дом або на пятую машыну, купіўшы якія будуць выхваляцца перад сваімі багаценькімі сябрамі, яны лепш укладуць гэтыя грошы ў бізнес.

Вельмі сумна ўсведамляць, што мала хто клапоціцца пра дабрабыт іншых людзей. Бо багацеі і самі могуць у любы момант збяднець, пазбавіўшыся сваіх слоў, і назапашванні ўжо не змогуць ім дапамагчы.

*(Запіс абрываецца)*

**За 2 месяцы да запісаў**

Дзверы расчыніліся, я сустрэлася вачыма з адным з мужчын. І тут прыйшло страшнае ўсведамленне... Мама. Яны прыйшлі па яе. Я рэзка зрабіла крок налева і ўхапілася за парэнчы лесвіцы. Ступіўшы на першую прыступку, я адчула, як адзін схапіў мяне і тузануў назад, у той час, як другі ўжо бег наверх. Я страціла раўнавагу, але мужчына ўтрымліваў мяне вельмі моцна.

«Мама!» – я паспрабавала крыкнуць. Але атрымалася толькі адкрыць рот. ШТО? Ды не можа такога быць!

«Мам!» – і зноў гэтая фраза засталася адно ў маёй галаве. А Божа... словы... яны... скончыліся.

Мужчына зацісну мне рот, выключаючы мае далейшыя спробы выратаваць яе. Я брыкацца, але беспаспяхова.

– Не тузайся, дурная ты дзяўчынка. Калі хочаш жыць, не варта дастаўляць нам праблем.

На секунду я зразумела, што мне будзе ўсё адно, што будзе са мной, калі мне ўдасца выратаваць маму. Я ведаю, што яна зрабіла б так жа.

З усіх сіл наступаю на нагу мужчыну, ён ледзь мяне адпускае, але гэтага хапае, каб вырвацца з яго хваткі. Прыступка, дзве, і тут жа адчуваю жар, які расцякаецца па маёй галаве, а адразу пасля – жудасны боль. Я падаю з лесвіцы, але ўсё яшчэ застаюся ў свядомасці.

– І не кажы, што я цябе не папярэджваў, – прахрыпеў ля самага майго вуха яго голас. Мужчына прыўзняў мае ногі, адцягваючы ад праходу.

Я адчуваю галавой халодную плітку, і гэта так прыемна перашкаджае пульсаваламу болю ў маёй галаве, астуджаючы месца ўдару. Я ўсё яшчэ не адключылася, але гукі для мяне заціхлі. Аднак два гукі застануцца ў маёй галаве на ўсё жыццё. Гэтыя жахлівыя, нямыя два стрэлы. Спачатку адзін, праз пару секунд другі. Я чула іх так выразна, што галава пачынала балець яшчэ мацней. Я зразумела, што ўсведамленне гэтага яшчэ доўга не наведае мяне. Я доўга не буду верыць у тое, што іх больш няма. Маіх бацькоў больш няма – я паўтарала гэту фразу зноў і зноў, выклікала гэта сабе, разумеючы, што горшы з усіх варыянтаў спраўдзіўся.

Праз пару секунд пачуліся паспешныя крокі.

– А з ёй што рабіць будзем? – дайшлі галасы.

– Дык забудзь пра яе, яна без прытомнасці, я высек яе. Слоў у яе таксама няма. Да таго ж асоб яна нашых не бачыла. Як апрытомнее, можа, і не ўспомніць нічога.

Аднак я ўсё запомніла. Іх тэмбр голасу, гук крокаў, які, здавалася, ішоў за мной цяпер пастаянна.

Я зразумела, што гэта былі рабаўнікі. Такія людзі кажуць бяздумна і шмат, што азначае, што ў іх шмат слоў. Я была ўпэўненая, што ў бацькоў яны ўсё забралі, гэта лагічна. І зразумела, чаму мяне яны не кранулі. У мяне 0.

Праз пару секунд дзверы зачыніліся...

У смерці бацькоў я вінавачу сябе. Калі б я не выдаткавала словы на свае нікчэмныя захапленні і нікому не патрэбныя хобі, я б змагла крыкнуць адно адзінае слова. Адно. Якая іронія... Гэтага мне не хапіла. Аднаго. Адзінага. Словы...

**Месяц пасля падзей**

Я маўчу. Не прамовіла з таго часу ні слова. Я не скарджуся, таму што лічу, што так правільна. Гэты боль усё яшчэ са мной. Мае словы вярнуліся... 50 мільёнаў, усе на месцы.

Я цяпер уладальніца нашага фонду, паўнапраўная гаспадыня, і грошы, якія паступаюць у кожную першую гадзіну новага месяца – мае. Цяпер так будзе. Я не хачу, каб з-за недахопу слоў паміралі ні ў чым не вінаватыя людзі. І я зраблю ўсё для таго, каб знізіць колькасць бедных. І не важна, змагу я гэта ці не. Зараз гэта мая адказнасць і, больш за тое, маё шчырае жаданне.

***Горбач Паліна Віктараўна,***

вучаніца X класа ДУА «Гімназія № 2 г. Брэста»